№ 97 Ausgabe B.

ГОМАН

№ 97 (293). Год III. Вільня, 10 сьнежня 1918 г. Цана 10 фэн. (5 кап.)

Дзьвінск заняты большэвікамі. Прыехаў Іоффэ і 4 большэвіцкія камісары. Зносіны з Рыгай разарваны.

ВІЛЬНЯ. Ад 10 да 22.XII прыватны рух на чугунках прыпынен.

ЛОНДОН (Рэўтэр). 7.XII. Бальфур заявіў карэспандэнтам, што думка стварыць саюз народаў з роўнымі для ўсіх правамі — гэта абсурд. Павялічаныне чы:ла дэмакратычныхгас дарстваў не забаспечыць захаваньня міра. Тут ён гаворыць не аб Нямеччыне, а аб новых дзяржавах усходняе Эўропы. Аб дэмакратыі можна гаварыць толькі ў дзяржавах з вышэйшай культурай. Мірная конфэрэнцыя займецца ўпарадкаваньнем Расеі. За цяперашнім расейскім урадам нельга прызнаць права на пасылку туды дэлегатаў.

ЛІБАВА. Прыбыўшыя сюды гэтымі днямі тры англіцкія крэйсэры і 9 Мінаносцаў паехалі назад у Копэнгагу.

БЭРЛІН. На нямецкі пратэст проці расейскіх напасьцей на Нарву, Пскоў і Клінцы савецкі ўрад адказаў, што ён заўсёды шукаў згоды знямецкай арміей і што ён з свайго боку пратэстуе проці спробы нямецкага ўраду кінуць цень на расейскі ўрад прад нямецкім народам. Нямецкая салдацкая рада ўсходняга фронту з гэтай прычыны заяўляе, што аб пляновай напасьці расейскіх войск не вызывае сумлеваньня і што расейская заява —брахня.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). 8.XII Спаўняючы камітэт бэрлінскай рады раб. і салд. высказаў расейскаму ўраду сваё здаволеньне жаданьем яго недапусьціць стычак з нямецкім войскам: „Мы вітаем яшчэ раз абяцанку паслаць на зьезд нямецкіх рад дэлегатаў ад Расеі“.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). 8.XII. Умяркаваныя социялісты наладзілі сягоньня 13 мітынгаў, на якіх прамоўцы іх гаварылі на тэму „соцыялізм і дэмакратыя“. Радыкальныя (незалежныя) соцыялісты сазвалі тры мытынгі пад адкрытым небам. Іх прамоўцы гаварылі аб небаспецы контррэволюцыі. Саюз „Спартак“ (большэвікі) мелі свой сход у парку Трэптов, на каторы зышлося каля 3.000 душ. Між іншым. прамаўляў Лібкнехт. Разрухаў і бітв не было.

ВІЛЬГЭЛЬМСХАФЭН. (В.Т.Б.) 8 XII. Салдацкая рада пры фэльдмаршалку Гіндэнбургу заяўляе, што ўсе спадзяваньні як левых, так і правых на армію з фронту ня споўняцца. Фронт стаіць за плячыма ўраду Эбэрта - Гаазэ і дамагаецца хутчэйшага сазыву устаноўчага сэйму, ў выбарах да каторага павінна прынімаць учасьце і армія з фронту.

БЭРЛІН. 9XII. Нарады ўраду і спаўняючага камітэту давялі да поўнай згоды між імі.

МЮЛГЭЙМ. (В.Т.Б.). 8. XII. „Сталёвыя бароны“ Аўгуст Тіссэн, Фрыдрых Тіссэн, Эдмунд Стінэс і генеральныя дырэктары сталёвалітняў арэштаваны радай салдацкіх і работніцкіх дэпутатаў за здраду гасударства: яны прасілі саюзьнікаў заняць прамышленыя акругі, каб забаспечыць іх фабрыкі ад магчымых народных разрухаў. Арэштаваных павязуць у Бэрлін і аддадуць іх тамака пад суд.

Арэштаваныя паслалі імперскаму канцлеру тэлеграму з пратэстам проці арэшту і з заявай, што яны не вінаваты ў тым, што на іх узводзяць.

БОНН. (В.Т.Б.). 8.XII. Сягоньня тут зьявіліся пярэднія часьці англінкіх окупацыйных войск.

ПРАГА ЧЭСКАЯ. (В.Т.Б.).8.XII На аснове умовы між вэнгерскім ваенным міністэрствам і францускай главнай камандай вэнгерскія войскі ачышчаюць словацкія комітаты.

ГААГА. Злучаныя Штаты далі пазваленьне на свабодны выказ ячменю, аўсу, кукурузы і кавы.

ГААГА. 8.XII. Б. англіцкі ваенны міністэр заявіў, што Англія мобілізавалася за 30 гадзін да абяўленьня вайны.

ПАРЫЖ (В.Т.Б). 8.XII. Пуанкарэ і Клемансо выехалі ўчора ў Мэц.

ПАРЫЖ. (В.Т.Б.) 8 XII. У часе стычкі пры Шато-Рэ забіты 68 і ранены 61 асоба.

БЭРЛІН. (В.Т.Б). 8 XII. Вянікая бэрлінская салдацкая рада перавагай 173 галасоў проці 76 адкінула прадлажэньне пры выбары дэлегатаў на зьезд саветаў (рад) кіравацца прынцыпам раўнапраўства работнікаў і салдатаў.

ГАННОВЭР. 7.XII. Массовы сход нямецкай дэмакратычнай партыі паслаў Эбэрту сваю рэзалюцыю, называючы палітыку цяперашняга соцыял - дэмакратычнага ўраду ганебнай, бо ўрад адцягівае сазыў устаноўчага сэйму, падпісаньне міра і бытнасьць чужацкіх войск і узвялічывае небаспеку развалу нямецкай дзяржавы. Рэзалюцыя дамагаецца сазыву устаноўчага сэйму ўраз-жа.

БЕЛАСТОК. Адзэлы тутэйшых нямецкіх банкаў 11 сьнежня едуць у Нямеччыну.

СУВАЛКІ. У апошнім часе тут ізноў зьявілася шмат падробленых „нямецкіх“ рублёў.

Вільня, 10 сьнежня 1918.

Асьцярожна, крок за крокам пасоўваюцца ўпярод большэвіцкія войскі, занімаючы ўсё новыя абшары Беларускай зямлі ў сьлед за адходам нямецкіх окупацыйных армій. А разам з гэтым між больш заможнымі станамі шырыцца страх перад анархіяй, страх перад зьнішчэньнем усяго, што яны прыдбалі і прызапасілі праз доўгія гады.

Страх гэны вызываюць ня гэтулькі самі большэвікі, сколькі банды грабежцаў, якія наплываюць да нас з Расеі перад рэгулярнымі болшэвіцкімі войскамі. Яны рабуюць усё і усіх, і неарганізаваны народ ня мае сілы бараніцца ад іх.

А поруч з імі рабуюць наш край розныя цёмныя элемэнты спаміж тутэйшых людзей, карыстаючы з таго, што нямецкія ўласьці выходзяць, а краёвая ўласьць толькі пачала арганізавацца.

Каб бараніць жыцьцё і меньне жыхараў краю, патрэбна краёвая аружная сіла—сваё войска, якое не дало-бы шырыцца анархіі і памагло-бы нашаму народу завясьці новы лад на сваей зямлі. Ды гэтага мала: трэба, каб увесь наш народ быў арганізаваны, каб кожная вёска, кожная воласьць праз сваіх выбарных дэпутатаў і свае валасныя рады сама кіравала сваім жыцьцём. Тады ўзмацуецца сіла нашага народу, і ён дасьць дружны і моцны адпор усім, хто

І. Сербаў.

Аб беларускай народнай песьні.

(Гл. „Гоман“ № 96).

Пасага і прыданыя. Назаўтрае госьці маладой вязуць яе пасагу. На першай хурманцы вязуць кубел, на каторым сядзіць малодшы брат маладое і музыка. На іншых хурмаках едуць прыданыя і пяюць:

Ой, пазвалі мяне
У прыданкі —
Чаркі гарэлкі
Не далі.
Ох, каб я ведала,
Не пашла-б,
Ці я-ж работы
Не нашла-б!
Ой, у запечку-б сабе
Сядзела,
Ды кудзелечку-б
Вярцела.
Напрала-б пачатак
З вушатак,
Напрала б прасьцень
З берасьцень! [1])

У маладога прыданыя шумна скачуць на лавах, пяючы:

Ой, дзе вы нашу
Маладую дзелі:
Ці па ваду паслалі,
Ці ў клець схавалі?
Клець адчыніце,
Нам яе пакажэце!
Мы-ж яе не 'дбяром,
Назад не павязём.
Мы-ж яе не 'ддавалі
Упрочкі не 'дганялі.
Сама яна захацела —
Замуж паляцела. [2])

* * *

Чаму нам ня пець,
Чаму ня гуляць,
Калі наша Ганначка
Харашэнька прышла!
Як маць радзіла,
Так яна хадзіла.
Як была пад хратом,
Так стала пад вянцом
Як была пялюнках,
Так стала ў жанушках!. [3])

Пасьля абраднай часьці на вясельлі бываюць балі, на каторых пяюцца песьні, узбышанныя як дзеля зьместу, так і дзеля свайго напеву. У гэтых песьнях выказваецца сямейнае гора, жыцьцё жонкі, туга дзяцюка.

Вясёлая бяседачка
Йдзе, мой татка п'е.
Ен п'е, ён п'е, радзімы мой,
За мной пасланы шле.
Я, молада—младзюсенька,
Забавілася;
За курамі, за гусямі
Замешкалася;
Ды за тою за птушкаю,
Да журоўкаю.
Журавачка па беражку
Паходжавае,
Палын траўку шаўковую
Сашчыкавае.
Што на той-жа на бок ракі
Стаяць тры дваркі.
Што у тых-жа дварочках
Жывуць тры кумы.
— Вы кумачкі-галубачкі,
Сястрыцы мае!
Як будзеце на луг ісьці,
Гукайце мяне!
Як будзеце краскі шчыпаць,
Нашчыплеце мне.
Як будзеце вянкі віці,
Саўіце і мне.
Як будзеце ў Дунай пускаць,
Пусьціце і мой.
Ды усе вянкі на верх плывуць,
А мой патануў.
Ды ўсе дружкі з вайны ідуць,
А мой ня вярнуўсь!

* * *

Горачка мая
Крутая;
Мамачка мая
Радная!
За што ты мяне
Скарала,
Ды за п'яніцу
Аддала?
Ня то п'яніца,
Што дзень п'е,
А то п'яніца,
Што дні трэ.
Ен на вуліцы
Усіх лае,
А прыдзе дамоў

[1]) Кульшычы.

[2]) Кульшычы.

[3]) Кульшычы.

цікуе на яго меньне, жыцьцё і волю.

Асабліва волю нашу павінны мы ў гэты мамэнт бараніць. Бо з розных канцоў працягіваюцца да нас прагавітыя рукі чужынцоў, каб ізноў нас паняволіць, каб устанавіць над намі чужацкую ўласьць і вырваць ад нашага народу тое, што для яго здабыла рэвалюцыя: зямлю.

Мы ня ведаем, што суліць нам заўтрашні дзень. Ня ведаем, якія новыя няшчасьці ждуць нашу Бацькаўшчыну. Але што-б ні здарылася, мы ўсё перацерпім, калі будзем мець моц самі ў сабе.

Дзеля таго, каб гэну моц у сабе вытварыць, цяпер найлепшы мамэнт. Выходзяць окупацыйныя ўласьці, і па іх астаецца пустое месца. Мы і павінны стварыць сваю ўласную ўласьць, бо як мы цяпер прасьпім, дык уладу над намі забярэ нехта другі.

Цяпер да ўсіх беларускіх паветаў (крэйзаў) назначаюцца камісары-беларусы. Яны будуць памагаць нашаму вясковаму народу арганізавацца. Яны дадуць ў кожным прыпадку добрую раду, як і што рабіць. Толькі мы самі спаць у шапку не павінны, бо што мы цяпер прапусьцім, таго мо' ніколі ўжо спагнаць ня ўдасца.

Пабеда Петлюры.

Ужо некалькі тыдняў таму назад на Украіне узьнялася вострая аружная барацьба між украінскім народам і гэтманскім урадам.

Гэтман Украіны, Скоропадскій, як вядома, захапіў у свае рукі ўласьць гвалтам—з благаслаўленства старога нямецкага правіцельства. Зусім чужы ўкраінскаму народу, гэты маскоўскі генарал зразу-ж павёў палітыку абмаскоўленьня Украіны і звароту яе ізноў пад панаваньне „ядынай, недзялімай“ Расеі. Дзеля гэнае мэты ён згаварыўся з начальнікамі расейскіх дабравольчаскіх армій—Краснова, Дэнікіна і інш., каб разам з імі пачаць паход у Маскву—проці большэвікоў і пасадзіць тамака на пасад новага цара.

Супроць гэтага падняўся ўвесь украінскі народ. Украінскі Нацыянальны Саюз, у каторым злучыліся ўсе шчырыя ўкраінскія дэмакраты, апавесьціў на ўвесь край, што ніводзін украінец не павінен мяшацца ў унутраныя справы Маскоўшчыны. Усе ўкраінскія сілы павінны быць аддадзены на будаваньне незалежнай Украінскай Народнай Рэспублікі—без ніякіх цароў і гэтманаў. І вось на Украіне ўзьнялося паўстаньне проці гэтманскай ўласьці пад камандай вядомага ўкраінскага рэвалюцыянера Петлюры.

З усіх канцоў краю паплылі грамады шчырых сыноў Украіны да арміі Петлюры. З кожным днем расьлі сілы рэвалюцыянераў, кіруючыся на сталіцу Украіны—Кіеў. Дарма саюзьніцкія дзяржавы палохалі іх, што захват Кіева войскам Пэтлюры яны лічуць выступленьнем проці саюзьнікаў: нішто не магло супакоіць гневу народнага. Пасьля чысьленых бітв „петлюраўцы“ падыйшлі да Кіева.

6 сьнежня ў Вільню прышла радасная вестка: войскі Петлюры здабылі Кіеў штурмам, гэтманскія найміты паддаліся ім. У палон узята 10.000 салдатаў і 500 афіцэраў.

Вітаючы гэту пабеду ўкраінскага народу над панаваньнем маскоўшчыны, мы бачым у ей прадвесьніка пабеды вялікай і сьвятой ідэі *незалежнасьці Украіны*. Але барацьба яшчэ ня скончылася: яшчэ стаяць на Украіне варожыя сілы пад камандай Денікіна і іншых маскоўскіх генаралаў, якія маняцца ад Украіны пачаць адбудову старой самадзяржаўнай Расеі. І мы жычым украінскаму народу сілы і энэргіі ў змаганьні з гэтымі чужакамі, бо пабеда ідэі незалежнасьці на Украіне—гэта пабеда яе і на Беларусі, і на ўсіх тых землях, якія ў часе сусьветнае вайны і рэвалюцыі вызваліліся з-пад маскоўскага панаваньня.

І. Мелешка.

Аб разьвязцы зямельнага пытаньня.

(*Канец* *)

Усе разгледжаныя зямельныя праграмы тварыліся ў часе барацьбы за ўласьць між народам і панамі, за каторымі стаяў урад. І ў кожнай праграме ярка прабіваецца гэта барацьба: рэвалюцыянеры паказвалі сялянам на зямлю, каб пацягнуць іх да змаганьня з царскім панаваньнем, і сваімі аграрнымі праектамі маніліся здаволіць інтарэсы *толькі* хлебаробаў; казённыя і буржуазныя праграмы баранілі карысьці *толькі* паноў. Але і адны і другія забываліся аб адным: што зямля павінна служыць ня толькі вясковым, а ўсяму народу і ў тым ліку мястовым работніцкім массам, што яна корміць *увесь край — усіх жыхараў яго.*

Толькі ўвесь народ у сваім цэлым мае права распарадку зямлёй, толькі ён — найвышэйшы гаспадар усіх зямельных абшараў і прыроднага багацьця краю — лясоў і нетраў зямлі. Гэтае права рэвалюцыя цяпер за ім і ўмацавала. І народ наш павінен выдаць такі закон аб зямлі, каб дайсьці зразу дзьвёх мэт: *здаволіць зямлёй малазямельных і беззямельных хлебаробаў і забясьпечыць хлеб для усяго краю.*

Малазямельныя і беззямельныя сяляне маюць *права* на зямлю — на тое, каб яны маглі з яе жыць сваей працай. Але гэтае права ускладае на ўсіх хлебаробаў і *абавязак:* дабываць хлеб і для тых, хто жыве ў месьці і працай сваей вырабляе ўсё, што патрабуе наша вёска для душы і для цела. Калі-ж глянем на сучаснае палажэньне сельскае гаспадаркі ў нашым краю, дык убачым, што тут сялянская гаспадарка — пераважна малазямельная, вядзецца блага (бо гаспадар цёмны і ня мае вольных грошы на паляпшэньне яе) і дае зусім мала хлеба — адно каб пракарміць сям'ю хлебароба і часам пуд-другі прадаць у суседнім мястэчку на аплату падаткаў. Не сялянская, а дворная гаспадарка была дагэтуль глаўным дастаўцам хлеба для нашых мест.

Калі мы гаворым аб праве малазямельных і беззямельных хлебаробаў на зямлю, дык гэта значыць, што ім *зямлю трэба даць. Гэта і зробіць рэвалюцыя.* Але скуль узяць гэну зямлю? Вядома, што ў нашым краю казённых зямель шмат, ды гэта пераважна адзін толькі лес, каторага зьнішчыць нельга: ён-жа нашае найвялікшае багацьце! Зусім мала ў нас і зямель удзельных, царкоўных, касьцельных і манастырскіх. Дык ясна, што ўсіх іх, разам узяўшы, ня хопіць дзеля надзелу ўсіх малазямельных і беззямельных сялян. Значыць трэба ўзяць зямлю ад паноў, у руках каторых — 40% усіх зямельных абшараў Беларусі. І закон аб зямлі, які павінен быць устаноўлен народнымі дэпутатамі на нашым *устаноўчым сэйме*, загадае *прымусовы* пераход дворных абшараў у рукі народу. Даволі ўспамянуць, што як старыя расейскія законы, так і законы усяго сьвету пазвалялі прымус. браць прыватную зямлю пад чыгункі, вуліцы, дарогі і на іншую агульную патрэбу; зямельная ж рэформа — гэта найвялікшая агульная патрэба, бо ад яе залежыць быт і шчасьце мільёнаў людзей!

Прыклад Вялікарасеі, аб якім ужо тут успаміналася, паказвае, як *ня трэба і ня можна* праводзіць разьдзелу панскіх зямель. Тамака сяляне проста нападалі на двары, разьбіралі і развазілі скаціну, нішчылі машыны і прылады, якія ў сялянскай гаспадарцы не маглі быць ужываны, а будынкі найчасьцей палілі. Зямлю дзялілі гэтак, што кожын браў не столькі, сколькі далеў захапіць. З сваімі-ж сошкамі якія не зьмяніліся за тысячу гадоў, сяляне, падзяліўшы дворныя абшары, не маглі вырабіць усяе ральлі. Ня менш паловы ўсей орнай зямлі ў Вялікарасеі сёлета пуставала. Гэтак у Расеі, здавён-даўна кârміўшай некалькі чужых дзяржаў сваім хлебам, узьняўся страшэнны голад, і месты, ня маючы чаго есьці, аб'явілі праўдзівую вайну вёскам, пасылаючы ў іх за хлебам ваенныя экспэдыцыі.

Само сабой зразумела, што аб справядлівасьці пры такім разьдзелі ніхто і ня думаў: хто з сялян меў многа, ў таго сталося йшчэ больш, а ў малазямельных частагуста ўсё аставалася па стараму. Гэтага у нас не павінна быць. Рэвалюцыя дала народу права на зямлю, і ён яе возьме, як законны валадар, але толькі паводлуг справядлівых, выданых ім-жа, законаў. Ніякія напады і разгромы ня маюць ніякае мэты; болей таго: яны шкодны і небяспэчны для самога народу, — як для сялян, паміж каторымі можа узьняцца ўнутраная барацьба, так і асабліва для мястовых работніцкіх масс.

Зямлю трэба дзяліць з толкам і разумна. Трэба зрабіць акуратны зямельны спіс: колькі зямлі мае кожная сялянская гаспадарка. Тады павінна быць устаноўлена: пры якім разьмеры гаспадаркі селянін здалее ня толькі пракарміць сябе, але і прадаць для места патрэбную меру хлеба. Інача́й кажучы: трэба намеціць *плян рацыянальных дробных сялянскіх гаспадарак*, якія ўсе разам давалі-бы гэтулькі хлеба, каб ад разьдзелу дворных зямель не зруйнавалася нашае эканамічкае жыцьцё і не настаў-бы голад.

Для гэткіх рацыянальных гаспа-

*) Глядзі пачатак № 96 ў „Гомана“.

Мяне б'е!
Маць дачушачцы
Гамоне
Йна дачушачцы
Гавора:
— Уважай, доня,
Уважай,
Ды ў зялёны сад
Убягай.
У зялёным саду
Зязюля, —
Йна вякуе —
Кукуе!
— Ніхто зязюлі
Ня чуе; —
Толькі пачула
Сястрыца.
Пачула мяне
Сястрыца,
У браду ваду
Бяручы;
Чыстую ваду
Бяручы,
Чэраз горачку
Нясучы.
Ніхто горачкі
Ня зрые.
Зрые горачку
Вадзіца,
Зьмене горачка
Зямліца! [4])

* * *

Ой, я ў горы нарадзілася,
Ка мне гора прыкацілася.
Як была я ды ў пялюшачках,
Гора маё ў падушачках.
Як я ў люльцы калыхалася,
Мною гора ўцешалася.
Як я стала каля лавачкі,
Гора маё мне ў рукавачкі.
Як стала я па хаце хадзіць,
Гора мяне пад ручкі вадзіць.
Як стала я каля печачкі,
Маё гора мне за плечачкі.
На вуліцы пяюць песенкі,
Майму гору пець ня хочацца.
Усьлед за мною ўсё валочацца,
Як пайду пад ігрушачкай;
Я ад гора схаранілася,
Мяне гора не забылася! [5])

* * *

Не жаніўся я —
Красата была,
Ажаніўся я —
Сухата адна!
Ды і ўзяў сабе
Жану малую,
Жану малую,
Жысьць неўдалую.
Вось пайду молад,
Ды ў новы горад;
Там куплю сабе
Караб новенькі,
Маляваненькі!
Пасаджу жану
Ды ў новы караб.
Вось пушчу караб
На сіня мора.
Сам буду глядзець,
Як караб плывець.
Вось караб плывець,
Як сокал ляціць,
А грабцы грабуць,
Як мятлой мятуць.
А жана сядзіць,
Як баярыня.
Вось яна плача,
Як рака б'ецца,
А мне малайцу
Жаласна стала.
— Ды вярнісь, жана —
Жана мілая!
А ня буду біць,
Стану з табой жыць.
— А я не вярнусь
Ды тут утаплюсь! [6])

* * *

Ой, бяда ды на салаўя,
Што ня ўдалая зіма!
Ні ў палёт салаўю ляцець,
Ні пад кусьцікам сядзець.
Ды ў палёт салаўю ляцець, —
Дробен дождзык засячэць.
Пад кустом салаўю сядзець, —
Мяцеліца замяцець!
Ой, бяда ды на малайца,
Што ня ўдалая зіма!
Ані ў пір ды з ёю пайсьці,
Ні ў бяседзе пасядзець.
Калі ў пір ды з ёю пайці —
Толькі пасварыцися.
А ў бяседзе з ёю пасядзець —
З жанаю пабіціся! [7])

(Далей будзе).

[4]) Кульшычы.

[5]) Кульшычы.

[6]) Кульшычы.

[7]) Кульшычы.

дарак і трэба ўзяць зямлі стольki, *скольki прыдзецца і дзе прыдзецца*.

Пакуль будзе праваздаца ў жыцьцё закон аб зямлі, нельга дапусьціць, каб гаспадарка на дворных абшарах спынілася хоць на адзін мамэнт. Пераход панскіх зямель у *нацыянальны зямельны фонд (запас)* павінен адбывацца ў меру разьвіцьця каморніцкіх работ па разьдзелу і прыспасабленьня сялян да перастроеных на новых асновах хутароў.

Само сабой разумеецца, што поруч з надзелам малазямельных і беззямельных хлебаробаў зямлёй і устройствам рацыянальных дробных гаспадарак (фэрм) народная ўласьць павінна павесьці правільную зямельную палітыку: навучаць сялян лепшых спосабаў гаспадаркі (школы, лекцыі, пакаяныя хутары, выстаўкі і інш.) наладзіць ім даступны і танны крэдыт як на дробныя гаспадарскія патрэбы, так і на мэліорацыю; дзе гэта вымагае лішне вялікіх выдаткаў, праводзіць мэліорацыю на агульны кошт; памагаць у куплі лепшых машын і прылад для працы, штучных гнаёў і інш.; памагаць у арганізацыі сельска-гаспадарскіх промыслаў, паддзержываць усялякія хаўрусы (коопэрацыя) і т. д. І чым больш энэргічна будзе вясьціся гэткая работа, тым хутчэй зямельная рэформа дойдзе да канца, тым хутчэй сяляне здалеюць узяць у свае рукі ўсю зямлю і прыняць на свой адказ справу кармленьня сваім хлебам усяго нашага народу, — хлебам, за каторы дастануць з мест ўсё, што патрэбна ў гаспадарцы.

Гаворачы аб зямлі, нельга не ўспамянуць аб нашых лясох.

Углядаючыся на тое, як апошнія гады пустошылі нашы лясы розныя спэкулянты і як вынішчыла іх «лясная гаспадарка» за час вайны, мімаволі зьнімае страх за нашу будучыну — за будучыну Краю, які абрабовываюць з яго найдаражэйшага багацьця. Лясы — гэта наш нацыянальны скарб, гэта нашае золата, наша будучая валюта, [illegible]ры выпуску дзяржаўных крэдыт[illegible]ак. А пасьля міра на іх накінуцца новыя рoi спэкулянтаў: ўласьнікі лясоў, падупаўшыя на грошы за ваенныя часы, пастараюцца чым хутчэй замяніць іх на грошы і ізноў гучна і шырока зажыць.. Гэтага дапусьціць нельга: ужо цяпер гасударственая ўласьць у нашым краю, якая б яна ні была, павінна забараніць прадажу лесу (ня толькі казённага, але і прыватнага), а установчы сэйм павінен выдаць закон, што *усе лясныя масывы*, так сама, як і нетры зямлі і воды, *становяць нацыянальнае мeньне*, гаспадарка каторым будзе знаходзіцца ў руках народнага ураду.

а—н—а.

АДОЗВА
Нацыянальнага Мужыцкага Саюза.

Сябры!

Калі ўсе народы рупяцца аб сваёй зямлі і волі, у нас, у межах нашага краю, ворагі свабоды памешчыкі і некаторыя прадаўшыяся паном сяляне і духавенства ўсімі сіламі стараюцца дабіцца, каб ані зямлі, ані волі нам не дасталося.

Карыстаючы з нашай цемнаты, на сходках, у касьцеле і ўсюды дзе можна зьбіраюцца подпісы аб прылучэньні нашага краю да Польшчы, і сяляне часамі падпісываюць на сваю згубу.

Ці нам патрэбна прылучэньне да Польшчы? Не! Прылучэньне да Польшчы патрэбна толькі паном. Паны, чуючы страх прад мужыком, што ён выцягне рукі па панскую зямлю, зьлітую потам і крывёй працоўнага народу, — паны, баючыся, каб ня сталася справядлівасьць народу, цягнуць да Польшчы, спадзяючыся, што польскае правіцельства, зложанае з такіх самых паноў, як і яны, абароніць іх і не дапусьціць да аддачы зямлі народу.

Не дайце сябе ашукаць ваўком у авечых скурах. Памятайце, што кожны, хто цяпер ідзе ў руку з панамі гэта вораг народу. Не запісывайцеся ні ў якія панскія арганізацыі, адцягавайце і сваіх сябраў ад запісаў у панскую самаабарону а тым больш ў легіоны. Памятайце, што гэта ёсьць панская сіла, з каторай паны маюць надзею налажыць ланцугі на нашы рукі, а мо' і завясьці новую паншчыну.

Што трэба рабіць?

Трэба выбраць валасныя і павятовыя камітэты складаючыся з 7 асоб. Дзведацца аб тым, як выбіраць камітэты, мужыцкі Саюз радзіць у абвестках павятовых камісараў.

Памятайце, што ад узяцьця сялянамі ў рук ўлады ў воласьці залежыць свабода народу, гэтакім толькі парадкам сяляне могуць дабіцца зямлі і волі.

Вібірайце ў валасны камітэт толькі тых, хто патрапіць бараніць нашай сялянскай справы. Хай ня будзе ў камітэце ні аднаго панскага слугі.

Хай жыве вольнае сялянства!

У Вільні і ваколіцах.

× **Патрэбны беларускія вучыцелькі.** Зварочавацца ў Беларускую Раду, Віленская вул. № 33.

× **Нямецкія войскі астаюцца?** Цэнтральная рада ўсходняга фронту зьвярнулася ў Бэрлін з просьбай, каб назначаныя дзеля абароны ўсходніх правінцый дывізіі былі пасланы ў занятыя землі быўшай Расеі. Гэтая справа вельмі сьпешная, і цэнтральная рада спадзяецца, што пасылка гэных дывізій у занятыя землі пачнецца не адкладаючы.

× **Нямецкія батальёны ахвотнікаў**, якія творацца ў межах Літвы, заменяць выяжджаючых ў бацькаўшчыну старых салдатаў і бацькоў сямей.

× **Цэнтральная салдацкая рада ў нашым краю.** З прычыны злучэньня глаўнай каманды 10 арміі з Militär-Gouvernement Litauen, новая цэнтральная салдацкая рада ў краю будзе складацца з 36 членаў—па 16 асоб ад 10 арміі і ад Mil. Gouv. Litauen.

× Загадам глаўнакамандуючага 10 арміей Militär-Gouvernement Litauen прыслухае глаўнай камандзе арміі.

× **Эвакуацыя нямецкіх войск.** Цэнтральная салдацкая рада ўсходняга фронту апавяшчае, што да 6 сьнежня з зямель быўшай Расеі вывезена толькі каля чвэрці усіх нямецкіх войск. Найменш вывезена з Украіны.

З Вільні ў Нямеччыну адыходзіць цяпер кожын дзень 21 поезд.

× **Дырэкцыя чыгунак 5** апавяшчае аб забароне перавозкі прыватных асоб і грузаў на вузкакалейнай лініі Сьвенцяны-Поневеж.

× **Карты на хлеб жонкам запасных** на студзень будуць выдавацца ў Штадтгаўптмана, Дамініканская 3,

для	4	цыркулу	— 9 і 10	сьнеж.
„	6	„	— 10 і 11	„
„	7	„	— 11 і 12	„
„	8	„	— 12 і 13	„
„	1	„	— 14	„
„	5	„	— 16	„
„	3	„	— 17	„
„	2	„	— 18	„

Хто не атрымае сваіх карт у гэтыя дні, можа атрымаць іх яшчэ 19 і 20.

З усяго Краю.

Польскія паны разагнаты.

Па вёсках бэцырку Андрэева Віленскага павету былі выбраны выбіральнікі ў бэцырк (воласьць). Усіх выбіральнікаў набралася каля 90 чалавек. У чацьвер 5 сьнежня ўсе выбіральнікі сабраліся ў м. Гургелі, каб з паміж сябе выбраць валасны камітэт. Пры гэтым тут сталося гэткае здарэньне. Заўзяты палёнізатар, кс. дзекан Шэпэцкі, разам з польскімі панамі ўпусьцілі часьць спагадаючых сабе людзей у клябанію, а рэшта асталася на двары. Тыя, што асталіся на вуліцы, зусім не маглі прымаць учасьця ў выбарах. Да іх толькі даходзілі няпеўныя галасы аб тым, што дзеялася ў хаце. Калі тыя, што стаялі на двары, неяк даведаліся што ў камітэт выбраны апрача кс. дзекана Шэпэцкага і некаторых сялян панскіх падлыжнікаў, яшчэ і паны, то не маглі выцярпець гэткага нарушэньня свайго права, выламалі сякерамі дзьверы клябаніі і разагналі ўсіх тых, што былі ў хаце.

Мясцовы.

ВЯЛІКІЯ САЛЕЧНІКІ (ад нашага карэсп.). Тут адбываліся ў клябаніі сходы, каб арганізаваць парахвіяльны камітэт. Камітэт маніліся рабіць разам з панамі. Аднак сяляне, ня веручы паном, востра выступілі проці гэткага камітэту. Такім парадкам з праектаванай арганізацыі нічога ня выйшла.

ПАРУДОМІНА. (Карэспандэнцыя да «Гомана»). 30 лістапада давялося мне прыехаць у мястэчка Парудоміну. Тутэйшыя жыхары пачалі мне апавядаць, што ксяндзы-палякі разам з панамі вымагаюць ад іх падпіскі на прылучэньне да Польшчы і што ў нядзелю, 1 сьнежня, мае адбыцца сход усіх вёсак Парудомінскай парахвіі.

У нядзелю сабралося многа народу. Ксяндзы: тутэйшы, з Рудоміна і з Прудзішча разам з польскімі панамі пачалі між людзьмі шырокую агітацыю за падпіску да Польшчы. Іншыя з агітатараў пужалі, што тых, хто не падпішацца, польскія легіоны прыйдуць і будуць біць нагайкамі. Людзі пачалі распытавацца мяне, ці гэта праўда, — і я ім разтлумачыў, што ўсё гэтае — брахня, ды што беларусы і літвіны ўжо пачалі будаваць сваё ўласнае гасударства і ўжо маюць сваіх міністраў. Тут сяляне пасьмялелі і прасілі мяне пайсьці разам з імі на сход, склікaны панамі.

Калі я туды прыйшоў, паны сустрэлі мяне вельмі непрыхільна, —а як я сказаў, што буду бараніць інтарэсаў беларусаў і літвіноў, якія супольна працуюць над вызваленьнем сваёй Бацькаўшчыны, дык кс. Слычко разчыніў вакно і сказаў: «Там табе месца будаваць Беларусь і Літву, а тут — Польшча»!

Сяляне-Беларусы Гродненшчыны!

Шмат бяды і нядолі прышлося напярпецца нашаму краю. Вайна спаліла нашыя вёскі, пазабівала лепшых, здаравейшых людзей, спустошыла і разарыла ўсю няшчасную Гродненшчыну. Расейскае начальства выгнала з родных хатаў сотні тысяч людзей і зрабіла з гаспадароў бяздомных бежанцаў. Іхнымі магілкамі засеяны ўсе дарогі Маскоўшчыны і Сыбіру, а з іхных сьлёзаў можа-б сабралося цэлае мора.

Але надыходзяць лепшыя часы. Вайна скончылася. Цары і паны, якія яе пачалі досіць ужо пакараны за гэтае злачынства. Па ўсім сьвеце валяцца царскія пасады, канчаецца панаваньне паноў і народы самі заводзяць для сябе як найлепшыя парадкі. Пасьля ўсёй нашай нядолі дабёмся свайго і мы, сяляне-беларусы. Завядзём і мы ў сябе лепшыя дэмакратычныя парадкі. Сам працоўны народ будзе панаваць на Беларусі, а ня жменька паноў. Зямля будзе належаць тым, хто сам на ёй працуе. Наш народ і нашую беларускую мову будуць паважаць на роўні з іншымі. Сам беларус будзе гаспадаром, а не парабкам на сваёй зямлі.

Але пакуль мы яшчэ слабыя і цёмныя і лёгка нас ашукаць нашым ворагам. А яны ня дрэмлюць ды куюць путы жалезныя на нас і на нашую волю. Паны-палякі, што панаехалі да нас з Польшчы, дагэтуль валадалі блізка што палавінаю нашай зямлі. Даўней яны трымалі наш народ ў паншчыне, а цяпер беларус цёмны і галодны сам мусіць працаваць і пот свой ліць дзеля іх карысьці. Ашуканствам забралі паны зямлю і трымалі сваю ўладу над народам. Цяпер яны, чуючы канец сваёй роскашы, прабуюць яшчэ раз ашукаць цёмны народ. Яны ўгаварваюць беларусаў-каталікоў, каб тыя запісаваліся на палякі і далучаліся да Польшчы. Гэтым яны спадзяюцца ўтрымаць пры сабе зямлю. Як раз такую самую штуку робяць з праваслаўнымі беларусамі іншыя прыблуды-расейскія чыноўнікі. Гэтыя хочуць аднавіць даўнейшыя парадкі і пасадзіць нам на шыю маскоўскага цара. Яны соладка сьпяваюць (як раз, як і палякі) быццам яны бароняць праваслаўную веру і народ. Але гэта няпраўда. Яны бароняць толькі свае маёнткі, што ім цары пароздавалі ды сваё даўнейшае панаваньне над намі. Далоў жа тых, хто ашуквае беларусаў! Ядыны і непадзельны Народ Беларускі. Вера ніяк ня можа служыць прычынаю, якая-б сварыла беларусоў. Усе мы і праваслаўныя і каталікі—адзін народ, дзеці аднае Маткі-Беларусі, бо аднаю моваю гаворым, бо мы аднае крыві. Хто сварыць беларусоў, той ашуканец і вораг нам найгоршы.

Польскія паны і іхныя найміты цягнуць нас і наш край да Польшчы. Маскоўскія паны і чыноўнікі цягнуць да Расеі. А што скажам мы, беларусы, яны ня пытаюць. Робіцца страшны гвалт над нашым народам. Ізноў нас хочуць закаваць у ланцугі, якія скінулі ўсе народы сьвету і якія з нас зваліліся. Дык трэба нам бараніцца. Трэба крыкнуць на ўвесь сьвет: не дамося! Годзе крыўды, годзе нашых сьлёзаў і поту папілі палякі і расейцы!

Браты сяляне! Усе народы самі пастанаўляюць аб сваёй долі. Трэба і нам гэта зрабіць. Трэба нам зьехацца з усяго краю ды падумаць аб сваіх справах і пастанавіць, чаго мы хочам. Вось дзеля гэтага Гродненскі Беларускі Камітэт пастанавіў сабраць **у Гродні 15 дзекабра гэтага году Беларускі Сялянскі Зьезд** з усяе Гродненскай губэрні і Аўгустоўскага павету, які так сама належыць да Беларусі. Кожная воласьць і кожын горад павінны прыслаць на гэты зьезд **па тры чалавекі** сваіх выбраных дэпутатаў. Яны і зробяць пастанову, як будзе далей, зробяць у нас такі самы дэмакратычны лад, як на ўсім сьвеце, будуць гаварыць і аб зямлі, аб тым, як зрабіць, каб яна адыйшла да працоўнага народу, як і калі склікаць Устаноўчы Сойм, каторы ўжо зробіць парадак назаўсёды. Будуць абгаворaны справы бежанцаў і адбудова спаленых або паруханых гаспадарак. Зьезд выбярэ Гронедскую Раду, якая будзе пілнаваць пастановаў зьезду і праводзіць іх у жыцьцё.

Прачнецеся, браты сяляне! Нішто ня можа затрымаць вас ад пасылкі дэлегатаў на зьезд. Глянь-це навакол! Усе народы ўзяліся за свае справы. Нельга чакаць і нам. Такі час рэдка здараецца, калі народ саўсім вольна можа дабівацца свайго. Хто не прапусьціць гэтага часу, таму будзе добра, а хто прапусьціць,—таго будуць клясьці і дзеці, і ўнукі.

Гродненскі Беларускі Камітэт.

5 дзекабра 1918 г.

г. Городня.

На гэтым грунце ў нас узьнялася спорка вельмі вострая, ды народ крэпка пастаяў за мяне. Тады прыступілі да выбараў. Польскія паны і ксяндзы праектавалі выбраць за старшыню камітэту парудомінскага ксяндза і двох палякоў у члены, ды 7 сялян. Пасьля маей прамовы народ гэта адкінуў. Наагул, людзі пасьмялелі: спаміж сялян пачалі выступаць прамоўцы, якія гаварылі проці польскага панаваньня.

У камітэт выбралі 9 беларусаў і 1 літвіна. *В.*

Як мьсьцяцца польскія паны.

Вёска Віндзюны, Віленскага п. Шумскай вол. Вёска гэтая сьвядомая. Тут кожны знае, што ён беларус і чаго яму патрэба. Няма дзіва, што гэткая вёска першая пачала думаць аб арганізацыі воласьці. Як пачалася рэвалюцыя, дык Віндзюнцы першыя пачалі казаць, што панскія польскія камітэты могуць быць шкодны для сялян, што канечна патрэбна выбіраць валасныя камітэты. За гэта віндзюнцаў паны і шумскі пробарщ (хай яму Бог дарue) называлі большэвікамі, хоць Віндзюны гэта беларуская зусім спакойная вёска, дзе ніякі большэвізм немагчымы. Наапошку паны усё ж ткі спагналі злосьць на сялянах. Сялянін з вёскі Віндзюн, Фаустын Мацуткевіч, раздаваў беларускія адозвы, каторыя заклікалі да арганізацыі. Аб немцах у адозвах зусім навет і гутаркі ня было. Польскія-ж паны ўдалі немцам быццам адозвы клічуць біць немцаў і Мацуткевіча жандары арыштавалі.

Гэтак робяць паны цяпер пры немцах, а што было-б, каб было іхнае польскае войска? і што станецца з бедным Мацуткевічам?

Сялянін.

Краёвы унівэрсытэт.

У Краёвым унівэрсытэце ў Вільні, які па загаду Тарыбы мае быць адкрыты у 1 студня 1919 г., на факультэце соцыяльных навук мае быць катэдра беларускай гісторыі, літэратуры і мовы.

Аб выхадзе немцаў.

З пэўнай крыніцы наказаваюць, што ў найбліжэйшым часе ждаць выхаду нямецкіх войск з Літвы не прыходзіцца.

Ліквідацыя і вываз нямецкіх прамысловых банкаў і іншых установаў тлумачыцца пераходам адміністрацыі краю з нямецкіх рук у мясцовыя і не прадвяшчае блізкога выхаду нямецкіх войск.

Аб часе аканчацельнага выхаду немцаў з нашага краю пакуль-што нічога сказаць нельга, — але ў кожным прыпадку ён адбудзецца не р ней студня месяца 1919 г.

ГОРАДНА. З прычыны ліквідацыі нямецкага управленьня Беласток-Горадня 7 сьнежня закрыўся.

БЕЛАВЕСЬ. Тартакі, маторы, лёкомобілі, вузкакалейныя торы і 50 рабочых каней з возамі і санямі, якія знаходзяцца ў Белавежскай пушчы, распрадаюцца па вольных цэнах.

КОЎНА. Гарнізон места будзе складацца з новаарганізаванага нямецкага баталіёну дабравольцаў. № 1.

З прычыны цяжкіх варункаў з ежай ў Нямеччыне чысло добравольцаў надта вялікае.

Плата на тутэйшай концы з прычыны дарагоўлі матэрыялу ў паўвялічана удвая.

5 сьнежня на Вілкамірскай вуліцы ў дому № 54 завалілася стольля. На шчасьце, людзей дома ня было і нікто ад гэтага не пацерпеў.

СУВАЛКІ. 5 сьнежня тут згарэла вапнапрудка.

ДОРПАТ. 5.XII. Нямецкія прафэсары пакінулі тутэйшы унівэрсытэт. Астаюцца толькі прафэсарынемцы з Балтыцкага краю.

ЛІБАВА. Англіцкі флот стаіць на рэйдзе звонку. Дэсанту ня будзе. Англіцкі флот выяжджае гэтымі днямі на поўнач

Украіна.

КІЕЎ. 4.XII. Міністэр заграгічных спраў, Афанасьеў, заявіў карэспандэнтам газэт, што доля як Украіны, так і ўсёе Расеі залежыць ад саюзьнікаў. Калі украінскія нацыяналісты дачасу і перавыжаюць, дык аканчальная развязка пытаньня аб Украіне залежыць ад саюзьнікаў. Кожная пабеда нацыяналістаў толькі павялічыць меру сьлёз і няшчасьця украінскага народу. Афанасьеў пераконан, што Расея знаходзіцца напярэдадні свае адбудовы. Пытаньне толькі аб тым, ці Расея адбудуецца, як здаровы арганізм ці як недарод.

БАЗЭЛЬ. 5.XII. Украінскае Тэлеграфнае Бюро наказывае, што Кіеў пасьля вострай бітвы папаў у рукі нацыяналістаў, якія ўзялі ў палон 10 000 салдатаў і 500 афіцэраў з арміі Скоропадскага.

БЕРДЯНСК. У газэце нямецкіх колоністаў „Neue Nachrichten“ саюзьнікі надрукавалі адозву, у якой кажуць, што ў нямецкім войску на Украіне бачуць абаронцаў ладу і ня будуць да іх адносіцца, як да ворагаў. Большэвікоў на Украіне і ў Вялікарасеі абвуляюць пазбаўленымі апекі закону.

Дзенікін загадаў кожнага дзесятага салдата савецкай арміі вешаць без суда.

З Фінляндыі.

ГЭЛЬСІНГФОРС 4.XII. Нямецкі палкоўнік ф. Гэдэр, начальнік генэральнага штабу фінляндзкай арміі, на жаданьне саюзьнікаў выйшаў у адстаўку.

ГААГА. 6.XII. Сягоньня выехаў першы транспорт нямецкіх войск з Фінляндыі. Эвакуацыя пэўне закончыцца 15 або 16 сьнежня.

З усяго сьвету

Н'Ю-ЁРК. Лянсінг заявіў, што ўсе споркі аб тым, хто быў вінавайцам вайны, ні да чаго давясьці ня могуць. Больш важная справа — гэта знайсьці цяпер пытаньнем аб адраджэньні чалавецтва. Сваім праектам саюза народаў Вільсон паказаў дарогу, па якой трэба йсьці.

ЛОНДОН. Генэральны дзяржаўны пракурор Сміс у выборчай прамове заявіў, што Англія не аддасьць ні нямецкіх калоніяў, ні Мэсопотаміі.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). 7.XII. Францускія газэты аднагалосна і, як відаць, па загаду зьверху, заяўляюць, што англіцка-француска-бэльгійскі саюз будзе стававіць асноўу будучай сусьветнай палітыкі. „Temps“, „Journal de Debats“, „Action Française“ заяўляюць, што да Бэльгіі павінен быць далучаны галяндзкі Лімбург, Люксэмбург і левы бераг Шэльды. Газэты пішуць, што пытаньне аб Шэльдзе цяпер ужо не тэорэтычнае, а вельмі рэальнае пытаньне.

„Echo de Paris“ з свайго боку наказывае, што Францыя будзе дамагацца выдачы нямецкіх параходаў, якія знаходзяцца ў саюзьніцкіх портах, каб пры іх помачы захаваць для Францыі належнае ёй паміж торговымі нацыямі месца.

БЭРЛІН. (В.Т.Б.). 6.XII. Англія ў Копэнгазе заявіла, што не дапусьціць больш нямецкага судаходства ў Балтыцкім моры. Гэты крок Англіі — нячутае нарушэньне умовы аб заміраньні.

ВІЛЬГЭЛЬМСГАФЭН. 6.XII Сюды прыбыў англіцкі флот. Англіцкі адмірал Браўнінг прадлажыў явіцца да яго дэлегацыі ад нямецкага флоту.

АМСТЭРДАМ. 5.XII. Нямецкі насьледнік заявіў корэспондэнтам газэт, што Нямеччына праіграла сусьветную вайну яшчэ ў восені 1914 году. Неспадзяваная шыбкая мобілізацыя расейскага войска, нядольнасьць аўстрыякоў задзяржаць расейцаў пры першым націску давялі да руіны плян нямецкага штабу, меўшый на мэце разграміць Францыю да пачатку станоўчага расейскага наступленьня. Віну за сёлетнюю катастрофу насьледнік ускладае на Людэндорфа, каторы, прыкрываючыся павагай Гіндэнбурга, падыктатарску кіраваў ня толькі ваеннымі, але палітычнымі справамі.

БЭРЛІН. 8.XII. Фэльдмаршалак Гіндэнбург апавяшчае, што ўсе войскі з Заходняга фронту вярнуліся ў назначаны час у свае гарнізоны. 20 дывізый астаюцца на граніцы нэўтральнага пояса дзеля старожы і паліцэйскай службы. Дзеля абароны уходніх правінцый туды пасланы некалькі дывізій, якія ужо прыбылі ў загаданыя месцы.

БЭРЛІН. 6.XII. Італьянскі ўрад конфіскаваў дом нямецкага пасольства ў Рыме. Нямецкі ўрад падаў пратэст проці гэтага.

БЭРЛІН. (В.Т.Б.). 6.XII. Чысьленае войска акружыла дом, дзе засядаў спаўняючы камітэт. Толькі пасьля таго, як дзеля абароны яго зьбегліся некалькі тысяч матросаў і работнікаў, войска адтуль адышлося.

Між староннікамі групы „Спартак“ (большэвікамі) і ўрадовым войскам ўчора была крывавая стычка. Спаміж дэмонстрантаў забіты 16, ранены 15 асоб.

Друкавана у друкарні М. Кухты. Выдавецтва «Гоман» Рэдактар Язэп Салавей.